равання ў дзяцей творчай музычнай актыўнасці.

Творчая дзейнасць у спалучэнні з цікавасцю да яе значна хутчэй пераходзіць у трывалую патрэбу, якая, аб'ядноўваючыся з эмоцыямі, надае моцны штуршок далейшаму пазнанню і самастойнай дзейнасці.

**Матук В.А.,**
*аспірант кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы*

# ПРАБЛЕМА АПТЫМІЗАЦЫІ ПРАФЕСІЙНЫХ ПАРАМЕТРАЎ ДЗЕЙНАСЦІ КІРАЎНІКОЎ АМАТАРСКІХ ЭСТРАДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ (інструментальныя ансамблі і аркестры)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эстрадная музыка даўно заняла трывалае месца сярод разнажанравых накірункаў і музычнага мастацтва ўвогуле і розных яго відаў у прыватнасці. Дзякуючы спецыфічнаму эмацыянальнаму ўздзеянню на слухачоў эстрадная музыка ва ўсёй яе разнастайнасці атрымала шырокае распаўсюджанне. Сур'ёзны аналіз яе сучаснага стану паказвае: развіваецца яна даволі супярэчліва. Тут выяўляюцца сапраўды унікальныя эфекты, арыгінальныя творчыя знаходкі, смелыя мастацкія пошукі, крайняя прымітыўнасць выканання, адсутнасць мастацкага густу (напрыклад, у не лепшых узорах выступленняў рок-груп).

Тэрмін "эстрада" ў перакладзе з французскай і іспанскай моў абазначае "ўзвышаную пляцоўку для канцэртнага выступлення артыстаў". Потым яго пачалі ўжываць у адносінах да розных відаў сцэнічнага мастацтва, у тым ліку музычнага. Перш чым разгледзець пытанне пра асноўныя параметры дзейнасці кіраўнікоў самадзейных эстрадных інструментальных саставаў (ансамбляў, аркес-

траў), высветлім таямніцу феномена эстраднага музычнага мастацтва, яго прыцягальнасці для прафесіяналаў і аматараў.

Перш за ўсё адзначым: разнавіднасці сцэнічных калектываў, якія працуюць у жанры музычнай эстрады (у тым ліку інструментальныя ансамблі, аркестры, што нас цікавяць), збіраюць значныя аўдыторыі слухачоў у параўнанні з камерна-інструментальнымі саставамі, сімфанічнымі аркестрамі, харавымі калектывамі. Гэта, у сваю чаргу, накладвае сур'ёзную адказнасць на артыстаў калектываў і іх кіраўнікоў. Не закранаем тут пытання прафесійнай этыкі менеджэраў або прадзюсераў калектываў, паколькі гэта ўяўляе асобную праблему. Поспех эстрадных музычных калектываў тоіцца не толькі ў магчымасці іх мець зносіны з рознаўзроставай і сацыяльна неаднароднай аўдыторыяй. Справа тут і ў іншым. Звернемся спачатку да аналізу характару музыкі, што гучыць з эстрады.

Адной з яркіх з'яў музычнай культуры, несумненна, з'явіўся джаз. "Некаторыя не пагодзяцца са мной у тым, што джаз — мастацтва, і, напэўна, будуць мець рацыю,— піша амерыканскі музыказнаўца Джэймс Лінкальн Каліер.— З'яўляецца джаз мастацтвам ці не — ён заваяваў любоў мільёнаў людзей на зямным шары... Мастацкі феномен джаза заслугоўвае самага сур'ёзнага вывучэння".

У першую чаргу, джаз павінен стаць аб'ектам сур'ёзнага даследавання з боку музыказнаўцаў, псіхолагаў, спецыялістаў па тэорыі культуры. Што датычыцца большасці выканаўцаў, то яны ў асноўным спасцігаюць тэхналагічныя, стылістычныя асаблівасці, манеру выканання, але не могуць абгрунтаваць значнасць джаза як віду мастацтва. Выключэнне складаюць вядучыя "зоркі" або карыфеі джаза, што творчасцю і выказваннямі, напрыклад у вядомым амерыканскім кінасерыяле, дапамагаюць дакрануцца да таямніц джаза, разабрацца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яго сутнасці.

"Разуменне джаза,— падкрэслівае амерыканскі музыказнаўца Рудзі Блэш,— супрацьпастаўленае толькі яўнай эмацыянальнай рэакцыі, патрабуе асаблівых намаганняў... Джаз пашырае нябачныя творчыя гарызонты, тонкасць гэтай музычнай з'явы несумненная, што аказвае ўплыў на развіццё нашага музычнага мастацтва. Але... джаз як мастацтва яшчэ пакуль застаецца мастацтвам у сабе, і гэта адбываецца з-за нашага глыбока рознага ўспрымання гэтага мастацтва як у час канцэртаў, так і ў цэлым".

Таму веданне сутнасці джаза, яго сацыякультурнага статуса, спецыфікі яго тэхналагічных, творча-выканаўчых працэсаў — адзін з сур'ёзных, нават асноўных параметраў работы кіраўнікоў калектываў (ансамбляў, аркестраў), якія выконваюць джазавую музыку. Калі кіраўнік калектыву не будзе прад'яўляць да сябе павышаных патрабаванняў па пашырэнні падобных спецыяльных ведаў у сваім жанры для таго, каб якасна арганізаваць працоўную і творчую дзейнасць, то пацерпіць фіяска як спецыяліст: не ўмеючы растлумачыць удзельнікам калектыву ўсе тонкасці мастацтва, да якога яны дакранаюцца, ён не атрымае аддачы ні ў выглядзе канцэртных нумароў або праграм, ні ў выглядзе далейшага працягу папулярызацыі сваімі музыкантамі джаза як віду экстравагантнага, вельмі арыгінальнага музычнага мастацтва.

Мы не схільныя абвінавачваць кіраўнікоў калектываў, асабліва самадзейных, у тым, што яны выяўляюць інертнасць, практычна абыякавасць у гэтым пытанні. Справа ў тым, што кола спецыяльнай літаратуры пра джаз на рускай мове не такое шырокае. Але можна паспрабаваць пазнаёміцца з лепшымі замежнымі выданнямі: ёсць адаптаваныя манаграфіі. У пашырэнні эрудыцыі кіраўніка яны адыграюць важную ролю. Пэўны аб'ём ведаў, акрамя таго, атрымаюць і ўдзельнікі калектыву.

Безумоўна, кіраўнік у рабоце павінен звярнуцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да аналізу творчасці вядучых джазавых музыкантаў і прадэманстраваць аўдыё- або відэазапісы іх выступленняў музыкантам. Шматлікія унікальныя фатаграфіі, вычарпальны матэрыял, напрыклад пра надзвычай папулярнага джазавага трубача і спевака Луі Армстранга, кіраўнік можа выкарыстаць з кнігі М.Джонса і Дж.Чылтана "Луіс. Біяграфія Луі Армстранга". Аднак удзельнікі калектыву мусяць ведаць і вядучых кампазітараў, аранжыроўшчыкаў, кіраўнікоў лепшых джазавых аркес-травых калектываў.

Яркім іх прадстаўніком, напрыклад, з'яўляецца легендарны Дзюк Элінгтан. Пра наватарства апошняга А.Валынцаў піша: "Знойдзеныя ім тэмбраспалучэнні, гармоніі, аркестравыя прыёмы, рытмічныя структуры апладнілі мастацтва джаз-аркестраў самых розных краін свету... Стварыўшы вялікую колькасць эталонных джазавых кампазіцый, Д.Элінгтан перарос рамкі гэтага жанру і стаў адным з буйнейшых кампазітараў нашага стагоддзя". Такім чынам, плануючы віды работы з удзельнікамі калектыву, яго кіраўнік павінен складаць тэматычны спіс вядучых выканаўцаў, дырыжораў розных калектываў, падбіраць адпаведны відэа- і фонаматэрыял пра творчую іх дзейнасць, змяшчаць інфармацыю ў канспектах для падрыхтоўкі рэгулярных гутарак, лекцый-канцэртаў, вечарын-"партрэтаў" і да т.п.

Дзеля таго каб кіраўнікі не апынуліся ў гэтым плане ў складаным становішчы, ім трэба добра арыентавацца ў айчынных выданнях па джазавым мастацтве. Напрыклад, фундаментальныя працы пра джаз як з'яву належаць музыказнаўцу В.Дж. Конен.Цікавыя матэрыялы пра айчынных выканаўцаў можна падабраць і з дакументальнай гістарычнай працы вядомага джазавага музыканта, музычнага крытыка А.Баташова. Гэта першая фундаментальная праца пра савецкі джаз 1970—80-х гг. Кіраўнік эстраднага калектыву павінен назапашваць таксама інфармацыю з публікацый перыядычнага друку пра беларускіх выканаўцаў джазавай і эстраднай музыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(напрыклад, пра дзейнасць прафесійных аркестраў пад кіраўніцтвам М.Фінберга, У.Цатурава, аматарскіх саставаў пад кіраўніцтвам В.Коназа, В.Сердзюка, навучальных калектываў пад кіраўніцтвам В.Міхновіча і інш.).

Улічваючы той факт, што ўдзельнікі эстраднага інструментальнага або эстраднага аркестра, як правіла, цікавяцца не толькі пытаннямі джазавага мастацтва, але і развіццём поп-, рок-музыкі і іншых напрамкаў і плыней музычнага мастацтва сучаснасці, кіраўнік калектыву не мае права пакідаць без увагі і гэтыя пытанні. Прадбачачы з'яўленне ва ўдзельнікаў калектываў такіх інтарэсаў, ён можа дапаўняць уласныя канспекты неабходным інфармацыйным матэрыялам, збіраць адпаведныя запісы. Так, ён не зможа пакінуць па-за ўвагай творчасць унікальнай Эдзіт Піяф. Шмат цікавага для сябе і ўдзельнікаў калектыву кіраўнік возьме са зборніка пра поп-музыку. Першапачатковую інфармацыю пра рок-музыку кіраўнік зможа падрыхтаваць па матэрыялах нарыса А.Феафанава. Улічваючы тое, што ўдзельнікі калектыву — гэта ў асноўным выканаўцы на духавых інструментах, кіраўнік можа сабраць інфармацыйныя, фотаматэрыялы пра выкарыстанне гэтых інструментаў у айчынных рок-групах. Не абысціся і без ведання матэрыялаў пра творчасць папулярнага ансамбля "Бітлз".

Такім чынам, разгледжаныя вышэй асноўныя параметры дзейнасці кіраўніка эстраднага інструментальнага калектыву характарызуюцца інтэнсіўнымі пошукам і адборам інфармацыйнага матэрыялу, падрыхтоўкай відэазапісаў, фанаграм, фатаграфій, а таксама актывізацыяй разумова-інтэлектуальнай дзейнасці па апрацоўцы раней назапашанага матэрыялу. Толькі выкананне ўсіх гэтых умоў дазволіць кіраўніку захаваць шанц заваяваць сімпатыі з боку ўдзельнікаў калектыву, умацаваць і павысіць свой аўтарытэт і, магчыма, смела выйсці са сталымі разважаннямі аб эстраднай, джазавай музыцы да аўдыторыі слухачоў у час арганізацыі канцэртных высту-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пленняў свайго калектыву.

Адным з галоўных параметраў дзейнасці кіраўніка з'яўляецца адбор удзельнікаў калектыву. Для адбору кандыдатаў у калектыў кіраўнік павінен пазнаёміцца з кожным удзельнікам асабіста, вызначыць асобасныя яго якасці (тэмперамент, кругагляд, выканальніцкую падрыхтоўку, матывацыю ўдзелу ў калектыве і да т.п.), потым пачаць правядзенне тэстыравання па дыягностыцы мастацка-выканальніцкіх задаткаў, здольнасцей, навыкаў. Гэта дапаможа кіраўніку намеціць для кожнага ўдзельніка перспектывы яго развіцця як эстраднага выканаўцы (спевака, інструменталіста).

Даволі складаным параметрам, на наш погляд, з'яўляецца выбар прагрэсіўных сістэм, што дазваляць асобнаму ўдзельніку, ансамблю, аркестру ў цэлым усвядоміць сутнасць, спецыфіку, тэхналогію, выканальніцкую манеру эстраднага і джазавага музіцыравання. Тут кіраўнік сутыкнецца, верагодней за ўсё, з двума напрамкамі: індывідуальнай падрыхтоўкай удзельнікаў, якая будзе дамінаваць на першапачатковым этапе работы, і групавой падрыхтоўкай (ансамбля, аркестравай групы, усяго саставу аркестра). Адным з прызнаных метадаў работы з'яўляецца выкарыстанне наглядных сродкаў у выглядзе табліц, схематычных малюнкаў (існуе набор табліц для эстраднага аркестра Д.Браслаўскага; многія кіраўнікі павялічваюць да фармату плакатаў схемы метрарытмічных, штрыхавых камбінацый з замежных дапаможнікаў).

У кіраўніка калектыву выклікае праблемы такі параметр работы, як фарміраванне рэпертуару. Можна арыентавацца на набыццё нотных выданняў, тыражыраваных друкарскім спосабам высокага або афсетнага друку ў выглядзе партытур, клавіраў, дырэкцыёнаў. Калі яны ў першапачатковым выглядзе не могуць выкарыстоўвацца для работы ў калектыве, кіраўнік можа адаптаваць іх шляхам пераінструментоўкі, купюр і г.д. Акрамя таго, кіраўнікі, як правіла, пазычаюць у сваіх калег і рукапісныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нотныя матэрыялы.

Адным з прэстыжных параметраў з'яўляецца стварэнне кіраўніком цікавых аранжыровак для калектыву. Перавагі гэтага напрамку бясспрэчныя. За кошт уласных аранжыровак кіраўнік зможа паводле свайго меркавання пастаянна вырашаць праблему пашырэння рэпертуару калектыву. Гэта спрыяе ўмацаванню аўтарытэту кіраўніка як у вачах удзельнікаў калектыву, так і сярод слухачоў, калег.

З адзначаным параметрам у пэўнай ступені пераклікаецца падрыхтоўка кіраўніком свайго сольнага выступлення з асобнымі канцэртнымі нумарамі (перад удзельнікамі калектыву, слухачамі). Тут, як і ў папярэднім выпадку, узнікае эфект заваявання кіраўніком аўтарытэту ў якасці выканаўцы.

Найбольш складанымі задачамі характарызуецца такі параметр, як арганізацыя ансамбляў малых формаў. Калі на першапачатковай стадыі работы з калектывам такія ансамблевыя саставы будуць выконваць толькі навучальныя функцыі, то ў калектыве са стабільнай канцэртна-выканальніцкай дзейнасцю яны змогуць арганічна ўвайсці ў канцэртную праграму, разгрупаваць сілы аркестрантаў на ўвесь аб'ём аркестравых твораў.

У заключэнне адзначым: разгледжаныя параметры, пералік якіх можна дапаўняць у залежнасці ад узроўню падрыхтоўкі кіраўніка, дазваляюць структурна і змястоўна канкрэтызаваць асноўныя напрамкі работы эстрадных інструментальных калектываў — ансамбляў і аркестравых саставаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ